УДК 94(100)"654"
ББК 63.3(0)5+63.3(0)6
Н725

Печатается по решению редакционно-издательского совета БГПУ

*Редколлегия:*
доктор исторических наук, профессор, заведующий кафедрой славянской истории и методологии исторической науки БГПУ *А. П. Житко*;
доктор исторических наук, профессор, заведующий кафедрой новой и новейшей истории БГПУ *Г. А. Космач* (науч. ред);
доктор исторических наук, профессор, заведующий кафедрой истории Беларуси БГПУ *А. М. Лютый*;
доктор исторических наук, профессор, заведующий кафедрой древних цивилизаций и средневековья БГПУ *В. В. Тугай*;
доктор исторических наук, профессор кафедры славянской истории и методологии исторической науки БГПУ *В. М. Фомин*;
кандидат исторических наук, доцент кафедры славянской истории и методологии исторической науки БГПУ *В. Г. Федорасова*

*Рецензент*
доктор исторических наук, профессор, заведующий кафедрой новой и новейшей истории БГУ *В. С. Кошелев*

Н725 **Новая** и новейшая история Европы и США: исследования, проблемы, поиски : сб. науч. ст. / редкол. А. П. Житко [и др.]; науч. ред. Г. А. Космач. – Минск : БГПУ, 2007. – 199 с.
ISBN 978-985-501-446-2.

В сборнике освещены актуальные вопросы новой и новейшей истории Европы, США и некоторые проблемы Второй мировой войны.

Адресуется студентам и аспирантам, научным работникам и обществоведам, всем интересующимся вопросами всемирной истории.

**УДК 94(100)"654"**
**ББК 63.3(0)5+63.3(0)6**

**ISBN 978-985-501-446-2**

© БГПУ, 2007

Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# НОВАЯ И НОВЕЙШАЯ ИСТОРИЯ ЕВРОПЫ И США:
## исследования, проблемы, поиски

*Сборник научных статей*

Минск 2007

у 30-х гг. XIX ст. Рамеснікі, якія выраблялі ватоўкі, склалі 1,1%, шмукляры – 0,9%, іншыя спецыяльнасці – 1,1%.

Засталася без змен удзельная вага групы рамеснікаў, якія апрацоўвалі металы, – 21,5%, хаця па колькасці гэтая група і перамясцілася на чацвёртае места. У ёй стала больш кавалёў, якія склалі 61,4% ад колькасці рамеснікаў, што займаліся апрацоўкай металаў. Бляхары склалі 11,1%, слесары – 7,8%, токары – 5,4, меднікі – 5,0, алавянікі – 4,4, майстры залатых спраў – 4,3, іншыя спецыяльнасці – 0,6%. 4% рамеснікаў былі заняты прыгатаваннем прадуктаў харчавання. У гэтай групе ўдзельная вага кожнай спецыяльнасці стала наступнай: мяснікі – 58%, пекары – 29,7, алейнікі – 6,9, млынары – 2,7, рыбнікі – 2,1 і іншыя спецыяльнасці – 0,6%.

Рамеснікі, якія займаліся вырабам посуду, складалі да канца вывучаемага перыяду 2% ад агульнай колькасці рамеснага насельніцтва гарадоў. Сярод іх асноўная група (94,7%) – гэта рамеснікі-ганчары.

Шэсць груп рамеснікаў у 30-х гг. XIX ст. склалі 96,8% усіх рамеснікаў. Такім чынам, удзельная вага спецыяльнасцей, якія не ўваходзілі ў склад названых груп, вырасла да 3,2%. Большасць іх складалі людзі, якія працавалі па найме (43,2%), і майстры гадзіннікавых спраў (19,4%). Узрасла колькасць жывапісцаў, перапісчыкаў, пераплётчыкаў (каля 27%). Астатнія спецыяльнасці склалі 10,4%.

Рост колькасці будаўнічых спецыяльнасцей, а таксама спецыяльнасцей, звязаных з абслугоўваннем (краўцы, шаўцы і г. д.), быў вызваны ростам гарадоў і колькасці гарадскога насельніцтва. Памянш.нне колькасці і ўдзельнай вагі ткачоў тлумачыцца павелічэннем колькасці і вытворчасці суконных мануфактур, якія ўвабралі частку рамеснікаў – ткачоў,ператварыўшы іх у наёмных рабочых. У першай трэці XIX ст. рамеснікі у гарадах Беларусі былі па-ранейшаму аб'яднаны ў цэхавыя арганізацыі. Цэхі, як адзначаў Ф. Энгельс, былі параджэннем натуральнай гаспадаркі і абмежаванасці абмену, рынкаў, устойлівасці форм вытворчасці, мясцовай замкнёнасці [25, с. 336].

Рамесныя цэхі ў гарадах Беларусі перажылі ў вывучаемы перыяд пэўныя змяненні, абумоўленыя сацыяльна-эканамічным развіццём. У параўнанні з першай паловай XVIII ст. скарацілася колькасць цэхаў, новыя цэвавыя арганізацыі стваралія рэдка. Ліквідацыя цэхаў часцей за ўсё адбывалася не за кошт знікнення рамесных спецыяльнасцей, а за кошт аб'яднання аднародных спецыяльнасцей у адзін цэх. Разам з тым колькасна павялічыліся цэхі, якія абслугоўвалі шырокае кола спажыўцоў. Перавага аб'яднаных цэхаў сведчыла аб тым, што колькасць рамеснікаў кожнай прафесіі паасобку была невялікая. Так, калі колькасць спецыяльнасцей у асобных гарадах Беларусі ў другой палове XVIII ст. хісталася ад 15 да 60, то колькасць цэхаў – ад 2 да 18 [26].

Дзейнасць цэхаў па-ранейшаму вызначалася статутамі. Кожны цэх меў свой статут. Цэхавыя рамеснікі падраздзяляліся ў канцы XVIII ст. на майстроў, чаляднікаў і вучняў. Крыніцы 30-х гг. XIX ст. адзначаюць, што ў цэхах бываюць «старшыны, чаляднікі, браты старэйшыя і браты малодшыя» [27], г. зн. вучні падраздзяляліся па ўзросце ці па «стажы» вучобы ў старшыны ці майстры. Узаемаадносіны паміж майстрамі, чаляднікамі і вучнямі рэгламентаваліся таксама цэхавым статутам. Чаляднікі і вучні поўнасцю падпарадкоўваліся майстру. Атрымаўшы атэстат майстра, рамеснік павінен быў выплаціць у цэхавую касу 7 руб., за што атрымоўваў права мець чаляднікаў і вучняў, колькі яму будзе неабходна і без абмежавання тэрміну [28]. Чаляднікам майстар павінен быў плаціць па дагаворы плату. Так, майстар мінскага малярнага цэха выплачваў чаляднікам па 20 кап. штодзённа [29]. Вучні таксама падпісвалі кантракт з майстрам, у якім абумоўліваўся тэрмін вучобы, абавязацельствы майстра выплачваць за вучня казённы падатак, за што вучань павінен быў працаваць бясплатна [30]. Тэрмін навучання ў кожным цэху быў розны. Напрыклад, у мінскім цяслярскім цэху ў 1834 г. тэрмін вучнёўства дасягнуў 4 гадоў; каб стаць майстрам, неабходна было працаваць яшчэ 4 гады чаляднікам. У цяслярскім цэху тэрмін вучнёўства быў 8 гадоў і тэрмін працы чаляднікам 7 гадоў [31]. У кавальскім цэху тэрмін вучнёўства складаў таксама 7 – 8 гадоў [32]. Такія вялікія тэрміны вучнёўства былі па сутнасці замаскіраванай формай закабалення вучня і скрытай формай аплаты за навучанне. Узаемаадносіны паміж вучнем і майстрам фактычна нічым не адрозніваліся ад адносін паміж кабальным чалавекам і гападаром.

На чале цэхаў стаялі цэхмайстры або старшыя майстры, якія выбіраліся кожны год на агульным сходзе членаў цэха. Усімі цэхамі ў горадзе кіравала рамесная ўправа. Цэхавыя статуты рэгламента-



вали колькасць чаляднікаў і вучняў. У Слуцку ў 1797 г. было 194 майстры, 157 чаляднікаў і 41 вучань, Слоніме адпаведна 50, 10 і 6, Бабруйску – 81, 29 і 19, Барысаве – 86, 29 і 45. Такім чынам, не кожны майстар меў хаця б па адным чалядніку і вучню. У Навагрудку, Кобрыне, Пружанах, Дзісне, Мазыры, Рэчыцы, Пінску ў 1797 г. быў 31 цэх, у які ўваходзіла 824 майстры, але не было ні аднаго чалядніка і вучня [33]. У 30-х гг. XIX ст. у Мінску налічвалася 455 майстроў, 100 чаляднікаў і 187 вучняў, у Віцебску – 269 майстроў, 12 чаляднікаў і 132 вучні [34].

Нягледзячы на тое, што ў канцы 30-х гг. XIX ст. працягваўся рост колькасці цэхавых рамеснікаў [35] і нават з'явіліся новыя цэхі (у 1837 г. быў створаны цэх камінараў у Мазыры і інш. [36] ), цэхі страчвалі сваю былую ролю і усё менш уплывалі на развіццё рамяства. У 1829 г. гродзенскі губернатар паведаміў у Міністэрства ўнутраных спраў, што «цэхавыя, па сутнасці мяшчане-хрысціяне і яўрэі, па родах іх рамяства хаця падзяляюцца на... цэхі, але і таварыствы такіх ніякіх капіталаў не маюць» [37].

Разам з тым павялічылася колькасць няцэхавых рамеснікаў, асабліва ў невялікіх гарадах. Так, у 1828 г. у Гарадку Віцебскай губерні цэхавых рамеснікаў не было, а »вольных», што не ўваходзілі ў цэхі, налічвалася да 35 чалавек [38]. Відаць, у невялікіх гарадах рамеснікаў адной ці падобных спецыяльнасцей было недастаткова для арганізацыі цэха. У цэлым цэхавых рамеснікаў было больш, чым рамеснікаў, якія знаходзіліся па-за цэхавымі арганізацыямі. У 1813 г. у гарадах Гродзенскай губерні ў цэхі было аб'яднана 2829 чалавек, а вольных налічвалася 352 чалавекі (суадносіны 8:1 [39] ), у 1829 у гэтай жа губерні налічвалася 1641 цэхавых і вольных 531 чалавек (суадносіны сталі 3:1) [40].

Узмацненне канкурэнцыі паміж майстрамі аднаго цэха ці роднасных спецыяльнасцей, цэхавымі і няцэхавымі рамеснікамі, мануфактурнай і рамеснай вытворчасцю значна аслабляла цэхавую арганізацыю.

У 1852 г. сенат выдаў указ, па якім ліквідавалася цэхавая арганізацыя ў гарадах і мястэчках, дзе колькасць рамеснікаў была нязначнай. У такіх гарадах можна было займацца рамяством, запісаўшыся ў рамеснае саслоўе, г. зн. не ўваходзячы ў цэх [41]. Рамесныя пастановы, распрацаваныя ў адпаведнасці з гэтым указам, ліквідавалі адасобленасць і самастойнасць цэхаў у гаспадарчых і юрыдычных пытаннях, знішчылі манапольнае права на вытворчасць. Ад запісу ў цэх вызвалялася вялікая колькасць рамеснікаў такіх спецыяльнасцей, як мастаўшчыкі, цесляры, надзёншчыкі, чорнарабочыя, рамізнікі і інш. Згодна з новымі пастановамі, членам цэха давалася права наймацца на фабрыкі і заводы.

Да сярэдзіны XIX ст. адбывалася павелічэнне рамесных спецыяльнасцей, змянілася ўдзельная вага розных груп рамеснікаў. Рамеснікі, занятыя вырабам адзення і абутку (краўцы, шаўцы, шапачнікі, пальчатнікі і інш.), складалі больш за 30% усіх рамеснікаў, група рамеснікаў, занятых вырабам прадметаў хатняга ўжытку і прылад працы (сталяры, токары, слесары, кавалі, бляхары, бондары і інш.), складала 15%, прадуктаў харчавання – 9%. Значна вырасла ўздельная вага рамеснікаў іншых спецыяльнасцей (гадзіншчыкі, ювеліры, мэбельшчыкі, шкляры, цырульнікі і інш.) [42, с. 26].

Рамяством займаліся і жыхары мястэчак. Адсутнасць дакументальных матэрыялаў не дазваляе вызначыць колькасць рамеснікаў у мястэчках беларускіх губерняў, хаця некаторыя агульныя звесткі сведчаць аб наяўнасці рамеснікаў розных спецыяльнасцей (краўцы, шаўцы, маляры, цесляры, слесары, меднікі, кавалі, бондары, шорнікі і інш.) [43]. Аднак характар местачковага рамяства істотна адрозніваўся ад гарадскога. Амаль усе мястэчкі належалі панам, таму і рамеснікі былі ў асноўным прыгоннымі [44]. Звестак аб прадукцыйнасці працы рамеснікаў, аб'ёме вытворчасці ў архіўных дакументах не захавалася, аднак некаторыя даныя дазваляюць вызначыць прыкладны аб'ём сярэднегадавой вытворчасці аднаго рамесніка ў рублях па г. Полацку. У 30-х гг. XIX ст. ён складаў каля 28 руб [45], у пачатку 60-х гг. XIX ст. – каля 32 руб [46], г. зн. аб'ём вытворчасці ў сярэднім на аднаго рамесніка амаль не змяніўся, хаця агульны аб'ём вытворчасці павялічыўся амаль у 1,2 раза (з 10830 да 13000 руб.), што тлумачыцца агульным ростам колькасці рамеснікаў.

Такі невысокі аб'ём вытворчасці беларускіх рамеснікаў сведчыць аб слабай сувязі іх з рынкам, а таксама аб яго вузкасці. Даныя аб развіцці гандлю пацвярджаюць, што асноўная маса выраблены х прадметаў спажывання рамеснікамі Беларусі асядала на ўнутраным рынку і сцвярджэнне асобных аўтараў аб тым, што большасць «рамесніцкіх тавараў вывозілася для продажу ў іншыя гарады, гу-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ